*ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (842) ● Чацвер, 23 сакавіка 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

## XV З'ЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ СССР

**У Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, працягвае работу XV з'езд савецкіх прафсаюзаў. З'езд дэманструе маналітную згуртаванасць савецкіх прафесіянальных саюзаў вакол Камуністычнай партыі і яе ленінскага Цэнтральнага Камітэта.**

**З трыбуны з'езда дэлегаты гавораць аб тым незабыўным уражанні, якое зрабілі на іх глыбокая і яркая прамова Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева, прывітанне з'езду ЦК КПСС, аб гатоўнасці рабочага класа краіны, калгаснага сялянства і народнай інтэлігенцыі паспяхова ажыццявіць намечаныя XXIV з'ездам КПСС велічныя планы камуністычнага будаўніцтва.**




# СЁННЯ НАМ 50

— Что б ни сделали мы,
Нам всегда по-хорошему мало,
И ведет нас вперед
Беспокойная наша мечта.

Гучыць у зале задорная камсамольская песня. Дзяўчаты і хлопцы з камсамольскімі значкамі на грудзях, шмат кветак, у глыбіні сцэны побач з бюстам Ільіча вялікая лічба — 50. Універсітэцкая камсамолія святкуе свой паўвекавы юбілей.

У прэзідыуме лепшыя камсамольцы універсітэта, выкладчыкі, былыя сакратары камітэта, госці з многіх ВНУ рэспублікі, з Калінінградскага універсітэта, з Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера. Пад гукі урачыстага маршу уносіцца сцяг камсамольскай арганізацыі і памятныя сцягі.

— Сёння мы сабраліся сюды, каб падвесці вынікі пяцідзесяцігадовага жыцця камсамола нашага універсітэта, — гаворыць сакратар партыйнага камітэта БДУ М. К. Гарбачоў.

**Так, слаўны шлях прайшоў наш камсамол, выхаванец і верны памочнік партыі. Ва ўсёй краіне не знайсці такога кутка, дзе б не працавалі нашы выпускнікі. Яны высока нясуць гонар сваёй ВНУ і ў гэты дзень віншуюць сваіх малодшых сяброў са святам. Вось адна з віншавальных тэлеграм:**

**— Дарагія сябры!**

**50 год — гэта многа і мала. Мяркуючы па вашых справах — гэта многа. Няхай справы вашай камсамольскай арганізацыі будуць заўсёды такімі вялікімі і цікавымі, як у мінулыя гады!**

**Поспехаў вам у камсамольскіх справах!**

На трыбуне сакратар ЦК ЛКСМБ В. І. Радомскі. Ён абвяшчае радасную вестку. За поспехі, дасягнутыя у справе выхавання моладзі, камсамольская арганізацыя універсітэта узнагароджана Памятным чырвоным сцягам.

— Гаворачы шчырае дзякуй за цёплыя віншаванні, мы клянёмся, што аддадзім усе сілы, усю энергію нашых маладых сэрцаў на справы у імя росквіту нашай Радзімы, — гэтымі словамі закончыў сваё выступленне сакратар камітэта камсамола універсітэта Алег Слука.

Шмат цёплых слоў, віншаванняў гучыць з трыбуны урачыстага пасяджэння. Нас вітаюць: намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. І. Красоўскі, сакратар камітэта камсамола 1956—58 гадоў, доктар філасофскіх навук Я. М. Бабосаў, намеснік сакратара камітэта камсамола педінстытута імя А. М. Горкага Вольга Башкірава, пасланец камсамоліі Горацкай сельгасакадэміі В. Разянкевіч і іншыя госці. Сярод іх і чалавек незвычайнага гераічнага лёсу Рыгор Нарсэсавіч Акопаў. У 1944 вызваленчым годзе танк, якім камандаваў Р. Н. Акопаў, першым увайшоў у Мінск. Цяпер легендарны танк стаіць на пастаменце ля Дома афіцэраў.

Рыгор Нарсэсавіч прыехаў з далёкага Каўказа да нас на свята. І вельмі шчыра гучаць яго своеасаблівая мова, яго сяброўскія віншаванні. А каб поўнілася наша жыццё цікавымі справамі, ён дорыць камсамольцам БДУ сімвалічны рог.



На стале прэзідыума шмат падарункаў. Фігурку з косці падараваў ад імя Саюза моладзі Хо Шы Міна Чан В'ет Хунг, многа кніг, прывітальных адрасоў.

На трыбуне Хайдрун Гетнер, кіраўнік дэлегацыі Саюза свабоднай нямецкай моладзі, студэнтка II курса філфака Іенскага універсітэта. Яна знаёміць прысутных са сваімі сябрамі Петэрам Кнаўэрам, студэнтам V курса сацыяльна-псіхалагічнага факультэта і Раймарам Бекерам, асістэнтам, сакратаром партыйнай групы камітэта ССНМ. Хайдрун расказвае пра работу ССНМ, пра яго задачы, уручае старшыні сходу вымпел для інтэрнацыянальнага студэнцкага будаўнічага атрада.

Всегда во всех делах
Наш комсомол — пример;
На славный комсомольский стяг
Равняйся, пионер!

Пад барабанны бой у зал уваходзяць юныя ленінцы. Здаецца, макі расцвілі вясной, а не чырвоныя гальштукі на грудзях у хлопчыкаў і дзяўчынак. Разам з кветкамі піянеры дораць удзельнікам урачыстага сходу словы падзякі за сяброўства і дапамогу, клянуцца, што вырастуць дастойнай зменай сваім старэйшым братам і сёстрам.

Уся зала падымаецца, каб праводзіць сваіх юных сяброў шчырымі апладысментамі.

Такімі ж апладысментамі была сустрэта прапанова прыняць зварот да усіх камсамольцаў універсітэта.

Гучыць Дзяржаўны гімн. Зал устае. Паглядзі, таварыш, на тых, хто стаіць побач з табой. Вось ён, твой сябар, памочнік, камсамолец. Шмат цікавых і добрых спраў на яго рахунку. Гэта той, каму сёння сказалі піянеры:

— За усе, што ёсць на свеце,
Дзякуй табе, камсамол!

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**











*НА ЗДЫМКАХ: (злева, зверху уніз) выступаюць сакратар ЦК ЛКСМБ В. І. Радомскі, студэнтка Іенскага універсітэта Х. Гетнер, член Саюза моладзі Хо Шы Міна Чан В'ет Хунг і Р. Н. Акопаў (справа уверсе).* Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

## ЗВАРОТ

### УРАЧЫСТАГА СХОДУ, ПРЫСВЕЧАНАГА 50-ГОДДЗЮ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ДА ЎСІХ КАМСАМОЛЬЦАЎ УНІВЕРСІТЭТА

**Таварышы камсамольцы!**

**Партыя Леніна дала нам, савецкай моладзі, верны жыццёвы курс. Партыя вучыць нас бязмежнай адданасці ідэям камунізму, рашучасці і смеласці у барацьбе за шчасце працоўных, наватарству і творчым адносінам да сваіх абавязкаў.**

**Мы звяртаемся да вас, камсамольскае юнацтва, у гэты знамянальны час, калі ўвесь савецкі народ з натхненнем выконвае рашэнні XXIV з'езда Камуністычнай партыі, калі кожны малады чалавек нашай краіны імкнецца дастойна сустрэць 50-годдзе з дня ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.**

**Наш універсітэт носіць імя вялікага Леніна. І гэта абавязвае кожнага з нас з пачуццём асаблівай адказнасці адносіцца да вучобы, разглядаць яе як найвышэйшы абавязак перад Радзімай і народам.**

**Мы заклікаем усіх камсамольцаў усямерна павышаць паспяховасць. Няхай да ліку 1200 камсамольцаў-выдатнікаў далучаюцца новыя і новыя імёны. Няхай кожны з нас паслядоўна выконвае лозунг «Ніводнага адстаючага ў нашых радах!»**

**Мы заклікаем усіх камсамольцаў універсітэта яшчэ шырэй займацца навукова-даследчай працай. Няхай кожны студэнт-камсамолец лічыць сваім абавязкам прыносіць практычную карысць Радзіме яшчэ у час вучобы.**

**Няхай кожны студэнт-камсамолец атрымае працоўную загартоўку на будоўлях краіны ў трэцім працоўным семестры.**

**Мы заклікаем вас, камсамолія універсітэта, глыбока вывучаць і засвойваць ленінскую ідэйна-тэарэтычную спадчыну—першаснову ведаў маладога спецыяліста, развіваць грамадска-палітычную актыўнасць, выхоўваць у сабе арганізатарскія навыкі.**

**У дзень свайго 50-годдзя мы заклікаем усіх камсамольцаў універсітэта адказаць новымі поспехамі ў вучобе і грамадскай працы на клопаты партыі аб студэнцкай моладзі і з гонарам выконваць вялікія запаветы Ільіча.**

**УДЗЕЛЬНІКІ УРАЧЫСТАГА СХОДУ.**

# У ГОНАР ВЯЛІКАГА СВЯТА

**НАСУСТРАЧ 50-ГОДДЗЮ ЎТВАРЭННЯ СССР**

Вучэбныя дысцыпліны, якія вядуць выкладчыкі кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва юрыдычнага факультэта, непасрэдна звязаны з вывучэннем праблем агульнасаюзнага і рэспубліканскага ладу. Напрыклад, па савецкаму дзяржаўнаму праву вывучаюцца працэс утварэння вышэйшай формы савецкай федэрацыі — СССР, узаемаадносіны членаў федэрацыі з федэратыўнымі органамі, палажэнні аб суверэнітэце СССР і саюзных рэспублік і г. д. Па савецкаму адміністрацыйнаму праву студэнты вывучаюць будову органаў дзяржаўнага кіравання у СССР, у саюзных і аўтаномных рэспубліках. Вывучаецца таксама многа іншых пытанняў аб федэратыўнай будове нашай Савецкай дзяржавы. Вось чаму так горача мы ўспрынялі пастанову ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя утварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік».

Абмеркаваўшы гэтую пастанову, выкладчыкі кафедры ўзважылі свае магчымасці і ўзялі сацыялістычныя абавязацельствы у гонар знамянальнай падзеі у гісторыі нашай Радзімы. Калектыў абавязаўся падрыхтаваць і выдаць тэматычны зборнік артыкулаў «50 год БССР у складзе СССР». Прадугледжваецца правесці сумеснае пасяджэнне нашай кафедры з кафедрай дзяржаўнага права юрыдычнага факультэта Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта, прысвечанае 50-годдзю Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. З юрыстамі Літвы у нас даўнія сувязі. Нашы сумесныя пасяджэнні заўсёды праходзяць жыва, цікава і з вялікай карысцю.

Сацыялістычныя абавязацельствы прадугледжваюць таксама правядзенне пасяджэнняў навуковых студэнцкіх гуртkoў, прысвечаных 50-годдзю утварэння СССР. Пры кафедры дзейнічаюць тры студэнцкія гурткі—па савецкаму дзяржаўнаму праву, савецкаму адміністрацыйнаму праву і савецкаму будаўніцтву. Шэраг тэм студэнцкіх навуковых дакладаў прысвячаецца дзяржаўна - прававым праблемам развіцця СССР і саюзных рэспублік.

Выкладчыкі кафедры абавязаліся прыняць актыўны удзел у навуковых канферэнцыях, зрабіць новыя наглядныя дапаможнікі па савецкаму адміністрацыйнаму праву і савецкаму фінансаваму праву. Па дагаворанасці з рэдакцыямі газет будуць прадстаўлены артыкулы, прысвечаныя 50-годдзю СССР. Кожны выкладчык абавязаўся выступіць па гэтай тэматыцы не менш двух разоў перад практычнымі работнікамі дзяржаўнага апарату і насельніцтвам.

Усе выкладчыкі рыхтуюць да публікацыі няпланавыя артыкулы, а М. Ф. Сцяпанка абавязаўся выдаць кнігу «Прававыя праблемы прысядзібнага землекарыстання у БССР».

У кабінеце кафедры прыцягвае ўвагу маляўніча аформлены стэнд. Ён адлюстроўвае нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва СССР, БССР і сімвалы усіх братніх саюзных рэспублік.

Разумеючы важнасць і значэнне вялікага свята —50-годдзя утварэння СССР, выкладчыкі кафедры імкнуцца падрыхтаваць яму дастойную сустрэчу.

**А. ГАЛАЎКО,**
**загадчык кафедры.**

# ДЗЕНЬ ЛЕКТАРА НА АЎТАЗАВОДЗЕ

**Чарговы дзень лектара на буйнейшым прадпрыемстве нашай сталіцы — аўтамабільным заводзе быў прысвечан 50-годдзю ўтварэння СССР.**

**З БДУ ў традыцыйным лектарскім выездзе прынялі ўдзел выкладчыкі гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў і кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў У. Н. Сідарцоў, І. А. Літвіноўскі, Е. Ф. Саўчук, А. У. Калымага, В. В. Сарокіна, Р. С. Маханёк, У. Ф. Ладысеў.**

**У абедзенны перапынак прама ў цэхах рабочыя праслухалі лекцыі «Роля У. І. Леніна ва утварэнні СССР», «БССР у братняй сям'і Савецкіх рэспублік», «Утварэнне СССР — перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі», «Развіццё нацыянальных адносін у СССР» і іншыя.**

**Вельмі цёпла прынялі ў праслаўленым калектыве прадстаўнікоў арганізацыі таварыства «Веды» БДУ.**

А. ГРЫЦКЕВІЧ.

# ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ ПАВЕДАМЛЯЕ

**Усе байцы СБА павінны праслухаць курс лекцый і здаць экзамены па тэхніцы бяспекі адпаведна графіку:**

**1. Студэнцкія будаўнічыя атрады, якія будуць працаваць на меліярацыйных работах,— 29 сакавіка, 5, 12 красавіка.**

**Пачатак заняткаў у 17.00 у актавай зале галоўнага корпуса.**
**Экзамен 19, 20 красавіка.**

**2. Будаўнічыя атрады, якія будуць працаваць у сістэме міжкалгасбуда,—30 сакавіка, 6, 13 красавіка.**
**Пачатак заняткаў у 17.00 у ніназале геафака.**

**6 красавіка заняткі у актавай зале галоўнага корпуса.**
**Экзамен 14 красавіка.**

**3. Атрады, якія будуць працаваць у сістэме будаўніцтва ў БССР,—31 сакавіка, 6 і 14 красавіка.**

**Пачатак заняткаў у 17.00 у актавай зале галоўнага корпуса.**

**Экзамен 17, 18 красавіка.**

**4. Атрады, якія у летні перыяд будуць працаваць у распараджэнні Міністэрства мясцовай прамысловасці, — 28 сакавіка, 11 красавіка.**

**Пачатак заняткаў у 17.00 у кіназале геафака. 11 красавіка заняткі ў актавай зале галоўнага корпуса.**

**Экзамен 15 красавіка.**

**5. Студэнты, якія уваходзяць у склад Мінскага гарадскога атрада,—4, 11, 18 красавіка.**

**Пачатак заняткаў у 17.00 у актавай зале галоўнага корпуса.**
**Экзамен 19, 20 красавіка.**

**6. Цалінныя студэнцкія будаўнічыя атрады і атрады, якія будуць працаваць у Томскай вобласці, — 3, 10, 21 красавіка.**

**Пачатак заняткаў у 17.00 у актавай зале галоўнага корпуса.**
**Экзамен 24, 25, 26 красавіка.**

**ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ.**

# КЛОПАТЫ ТРЭЦЯГА СЕМЕСТРА

Загарэлых, з агрубелымі мазалямі на руках і шчырай усмешкай на твары хлопцаў і дзяўчат у касцюмах байцоў студэнцкіх атрадаў БДУ імя У. І. Леніна летам сустрэнеш усюды: у гарадах і вёсках нашай рэспублікі, у Казахстане і у Томскай вобласці, на Далёкім Усходзе і у Комі АССР.

— Стала ужо добрай традыцыяй штогод у час летніх канікул накіроўваць дзесяткі студэнцкіх будаўнічых атрадаў у розныя куточкі не толькі сваёй роднай Беларусі, але і за яе межы, а таксама у братнія сацыялістычныя краіны — ГДР, Балгарыю, Польскую Народную Рэспубліку, — расказвае начальнік штаба працоўных спраў БДУ Уладзімір Адамушка.

Чацвёрты раз сёлета ён разам з сотнямі сваіх сяброў зноў адправіцца ў далёкі шлях—будаваць жывёлагадоўчыя памяшканні, жылыя дамы, школы, бальніцы. Той, хто хоць раз паспытае гэтага хлеба, на ўсё жыццё запомніць яго асалоду. І абавязкова, калі у наступны раз прыйдзе пара фарміравання студэнцкіх будаўнічых атрадаў, прыйдзе у камітэт і папросіць:

— Запішыце мяне...

Слухаў я Валодзю Адамушку і бачыў, што для гэтага высокага хударлявага юнака вельмі дарагія тыя дні, калі ён разам з сябрамі працаваў у студэнцкіх будаўнічых атрадах. Ды хіба для яго аднаго. Пабывайце ў гэтыя дні у камітэце камсамола універсітэта, на факультэтах і вы убачыце, што вельмі многа жадаючых працаваць сёлета ў студэнцкіх будаўнічых атрадах. Намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ Уладзімір Сілін разводзіць рукамі:

— Калі б мы і хацелі, то усіх не змаглі б узяць у студэнцкія будаўнічыя атрады...

Так, жадаючых многа. І таму ёсць з каго выбраць. Стала традыцыяй браць у атрады толькі тых, хто добра вучыцца, у каго няма нават троек. Перавага за тымі, у каго добрае здароўе, хто актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці.

Клопатаў у членаў штаба працоўных спраў БДУ цяпер шмат. Але перш чым гаварыць аб іх варта успомніць аб мінулагоднім трэцім семестры, аб тых, хто сваёй добрасумленнай працай даў права універсітэту увайсці у спіс лепшых ВНУ краіны па выніках работы студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

— 1672 студэнты ўдзельнічалі ў працоўным семестры мінулага года, — расказвае Уладзімір Адамушка. — Яны былі аб'яднаны ў 63 атрады. Аб тым, як працавалі нашы хлопцы і дзяўчаты, яскрава сведчаць граматы, дыпломы, падзякі, а таксама шматлікія пісьмы, якія прыходзяць у адрас нашага універсітэта. Амаль у кожным адна і тая ж просьба: «Прыязджайце, таварышы, і на наступны год».

...На стале стосікі пісьмаў. Праглядваеш іх з задавальненнем: нібы запраўскія будаўнікоў, запрашаюць студэнтаў кіраўнікі раённых і абласных арганізацый, калгасаў, саўгасаў і прадпрыемстваў. Было б недаравальна не назваць лепшых з лепшых байцоў атрадаў. Вось Леанід Давыдзенка — студэнт пятага курса гістарычнага факультэта. Чатыры гады запар працаваў у студэнцкіх будаўнічых атрадах, кіраваў адным з іх. На грудзях у яго ззяе медаль «За трудовое отличие». Такім жа медалем узнагароджан і Уладзімір Сілін. Працавалі, не шкадуючы сіл, Уладзімір Адамушка, Аляксандр Шаўчэнка, Уладзімір Лойка і сотні іншых. Адметна, што павялічваецца штогод сярод байцоў колькасць дзяўчат. І патрэбна аддаць ім належнае. З гордасцю называюць ва універсітэце прозвішчы Алены Андруховіч, Галіны Галалоб і многіх іншых. Дарэчы, Галіна Галалоб паедзе пяты раз у саставе студэнцкага будаўнічага атрада, і трэці раз яна узначаліць атрад. Калі заходзіць гутарка аб тым, які з Галі Галалоб камандзір атрада, то нават некаторыя хлопцы-камандзіры прызнаюць яе здольнасці і уменне.

Старанна працавалі байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта у мінулым годзе. За два месяцы асвоена капіталаўкладанняў на суму 2.935,5 тысячы рублёў.

У штаба працоўных спраў БДУ шмат клопатаў. Атрады ужо амаль сфарміраваны, удакладнены спісы. Каля 1.800 чалавек прыме сёлета удзел у трэцім семестры. 780 студэнтаў будуць працаваць у Беларусі, 250— у Мінску, 400— у Казахстане, 130— у Томскай вобласці і іншых месцах. Як і у папярэднія гады, 25 лепшых байцоў паедзе працаваць у Іену (ГДР). Адтуль прыедзе група нямецкіх студэнтаў, якія будуць працаваць у Мінску. 25 хлопцаў і дзяўчат з БДУ правядуць працоўны семестр у сталіцы Балгарыі Сафіі.

Камандзірамі і камісарамі зацверджаны лепшыя з лепшых. Цяпер яшчэ і яшчэ раз правяраюцца і удакладняюцца нават малейшыя дэталі, якія датычаць фарміравання атрадаў, заключэння дагавораў.

Не абышлося без некаторых перамен. Студэнцкія атрады сёлета будуць буйнейшымі. Гэта дасць магчымасць больш прадуктыўна працаваць, лепш наладжваць культурна-масавую работу.

Трэці семестр на парозе! Да яго рыхтуюцца, ім жывуць студэнты старэйшай навучальнай установы Беларусі.

**І. СЦЯПУРА,**
**студэнт.**



**НА ЗДЫМКАХ:** практычныя заняткі па праграміраванню у студэнтаў чацвёртага курса фізічнага факультэта. Вядзе іх ст. выкладчык М. С. Лазовік.

Фота Д. Чаховіча.



# СПАБОРНІЧАЮЦЬ СУПРАЦОЎНІКІ

На мінулым тыдні на маляунічых, залітых вясенпім сонцам узгорках станцыі Зялёнае было праведзена першынство мясцкома БДУ па лыжнаму спорту. У спаборніцтвах прынялі удзел зборныя каманды факультэтаў і кафедры фізвыхавання.

Спаборніцтвы пачаліся забегам мужчын на дыстанцыі 5 км. З першых жа метраў лідэрства захапіў Аляксандр Кохан, лабарант кафедры фізічнага выхавання і спорту, член зборнай каманды універсітэта. Ён першым закончыў дыстанцыю, апярадзіўшы на 2 мінуты М. Лагунова, які прыйшоў другім.

Жанчыны спаборнічалі на дыстанцыі 3 км. Перамогу атрымала старшы выкладчык кафедры фізвыхавання майстар спорту Людміла Капылова.

Агульны вынік спаборніцтваў прынёс перамогу камандзе кафедры фізвыхавання, на другім месцы дружны калектыў фізічнага факультэта, на трэцім — каманда хімічнага факультэта.

Пераможцам былі уручаны памятныя призы. Галоўны прыз прысуджан старэйшай удзельніцы гэтых спаборніцтваў кандыдату хімічных навук Т. П. Бабаеўскай.

Усе удзельнікі спаборніцтваў выканалі нарматывы новага комплексу ГПА. Спартакіяда мясцкома працягваецца.

**В. НІКІЦІН,**
**галоўны суддзя,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання.**
**М. ЦЕРАХАВА,**
**інструктар МК.**

# Спорт

## З ВІЗІТАМ СЯБРОЎСТВА

У суботу у басейне ІФК адбылася першая таварыская сустрэча зборных каманд плыўцоў Беларускага і Вільнюскага універсітэтаў. Яна прайшла ў вельмі цёплай, сяброўскай атмасферы.

Судзейства праводзілася сіламі плыўцоў другога саставу зборнай каманды БДУ. Упершыню выступаючы ў ролі суддзяў, рабяты акуратна справіліся з адказнымі абавязкамі. Хоць сустрэча была і таварыскай, але па вастрыні яна нічым не уступала матчавым спаборніцтвам. Як правіла, вынікі былі вельмі блізкімі, што даставіла нямала клопатаў суддзям.

Заплыў на 100 метраў вольным стылем у жанчын выйграла студэнтка першага курса геафака БДУ майстар спорту Іра Жураўлёва, а гэтую ж дыстанцыю ў мужчын хутчэй за усіх праплыў студэнт III курса хімфака Уладзімір Сямёнаў.

У стометроўцы на спіне лепшым аказаўся студэнт Вільнюскага універсітэта Т. Гаршва, а ў заплыве спосабам «дэльфін» на дыстанцыі 100 метраў першым быў наш плывец, студэнт I курса радыёфізікі Аляксандр Сямёнаў. Але затое камбініраваную эстафету 4×100 метраў хутчэй закончылі нашы госці — студэнты Вільнюскага універсітэта.

Хутка зборная каманда плыўцоў БДУ, якую трэніруе М. Ф. Кузьмянкоў, нанясе адказны візіт літоўскім студэнтам. У Вільнюсе адбудзецца другая таварыская сустрэча.

**Д. ВАРЫВОНЧЫК,**
**студэнт III курса філфака.**

# А. П. КЕСАРАВА



Рэктарат, партком, мясцком, супрацоўнікі біялагічнага факультэта смуткуюць аб заўчаснай смерці доктара біялагічных навук, прафесара Алены Паўлаўны Кесаравай, наступіўшай пасля цяжкай і працяглай хваробы.

Алена Паўлаўна Кесарава нарадзілася ў 1910 годзе ў сям'і урача. У 1931 годзе яна закончыла Смаленскі медыцынскі інстытут. У час Вялікай Айчыннай вайны Алена Паўлаўна была начальнікам шпіталя ў адной з авіяцыйных часцей III Беларускага фронту. Пасля вайны яна паступіла у аспірантуру і усё сваё далейшае жыццё прысвяціла навуцы і педагагічнай дзейнасці. У 1948 годзе абараніла дысертацыю на вучоную ступень кандыдата медыцынскіх навук, а ў 1959 годзе — дысертацыю на вучоную ступень доктара біялагічных навук.

Да 1964 года А. П. Кесарава загадвала кафедрай фізіялогіі ў Мінскім інстытуце фізічнай культуры, а з верасня 1964 года была прафесарам кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл БДУ.

Алена Паўлаўна Кесарава усё сваё жыццё аддала навуцы і выхаванню студэнтаў і была прыкладам нястомнай працавітасці, высокай прынцыповасці і партыйнага доўгу.

Партыя і урад высока ацанілі заслугі А. П. Кесаравай. Яна узнагароджана васьмю урадавымі узнагародамі, у тым ліку ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга за высокія паказчыкі работы у вышэйшай школе.

Светлая памяць аб Алене Паўлаўне назаўсёды захаваецца у нашых сэрцах.

# «ГАТОЎ ДА ПРАЦЫ І АБАРОНЫ СССР»

## IV СТУПЕНЬ — «ФІЗІЧНАЯ ДАСКАНАЛАСЦЬ»

**(ДЛЯ МУЖЧЫН 19—39 ГОД І ЖАНЧЫН 19—34 ГОД)**

**Патрабаванні**
**(Здача залiку)**

1. Мець веды па тэме «Фізічная культура і спорт у СССР».
2. Ведаць і выконваць правілы асабістай і грамадскай гігіены.
3. Ведаць асноўныя правілы грамадзянскай абароны і прабыць у процівагазе 1 гадзіну.
4. Умець растлумачыць значэнне і выканаць комплекс ранішняй гігіенічнай гімнастыкі.

**Практыкаванні і нормы**

| ВІДЫ ПРАКТЫКАВАННЯЎ | МУЖЧЫНЫ | | | | ЖАНЧЫНЫ | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 19—28 год | | 29—39 год | | 19—28 год | | 29—34 гады | |
| | На сярэбраны значок | На залаты значок | На сярэбраны значок | На залаты значок | На сярэбраны значок | На залаты значок | На сярэбраны значок | На залаты значок |
| 1. Бег 100 м (сек.) | 14,0 | 13,0 | 15,0 | 14,0 | 16,0 | 15,2 | 17,0 | 16,0 |
| 2. Крос 500 м (мін. сек.) | — | — | — | — | 2,00 | 1,45 | 2,10 | 2,00 |
| або 1.000 м (мін. сек.) | 3.20 | 3.10 | 3,45 | 3,30 | 4,30 | 4,10 | 5,00 | 4,30 |
| або 3.000 м (мін. сек.) | 11.00 | 10.30 | 11,30 | 11,00 | — | — | — | — |
| 3 Скачок у вышыню (см) | 130 | 145 | 125 | 130 | 110 | 120 | 105 | 110 |
| або скачок у даўжыню (см) | 460 | 500 | 400 | 460 | 350 | 380 | 320 | 350 |
| 4. Кіданне гранаты вагой 500 г (м) | — | — | — | — | 23 | 27 | 20 | 23 |
| 700 г (м) | 40 | 47 | 35 | 40 | — | — | — | — |
| або штурханне ядра вагой 4 кг (м, см) | — | — | — | — | 6.50 | 7.50 | 6.20 | 6.50 |
| 7,257 кг (м, см) | 7.50 | 9.00 | 6.50 | 7.50 | — | — | — | — |
| 5. Лыжныя гонкі 3 км (мін.) | — | — | — | — | 19 | 17 | 21 | 19 |
| або 5 км (мін.) | 25 | 24 | 30 | 26 | 35 | 33 | 38 | 35 |
| або 10 км (мін.) | | | — | — | — | — | — | — |
| У бясснежных раёнах Марш-брасок 3 км (мін.) | — | — | — | — | 19 | 17 | 21 | 19 |
| 6 км (мін.) | 36 | 33 | 38 | 36 | — | — | — | — |
| або веласіпедны крос 10 км (мін.) | — | — | — | — | 28 | 25 | 30 | 27 |
| 20 км (мін.) | 46 | 43 | 48 | 46 | — | — | — | — |
| 6. Плаванне 100 м (мін. сек.) | 2.05 | 1.50 | 2.15 | 2.05 | 2.20 | 2.00 | 2.30 | 2.20 |
| 7. Падцягванне на перакладзіне (колькасць разоў) асабістая вага да 70 кг | 9 | 13 | 6 | 9 | — | — | — | — |
| асабістая вага 70 кг і больш | 7 | 11 | 4 | 7 | — | — | — | — |
| або штурханне штангі ад грудзей (у % ад асабістай вагі) асабістая вага да 70 кг | 55 | 75 | 50 | 55 | — | — | — | — |
| асабістая вага 70 кг і больш | 65 | 85 | 60 | 65 | — | — | — | — |
| або згібанне і разгібанне рук ва упоры лежачы на гімнастычнай лаўцы (колькасць разоў) | — | — | 12 | 14 | 12 | 14 | 8 | 10 |
| або падыманне і апусканне тулава у палажэнні лежачы, рукі за галаву, ногі замацаваны (колькасць разоў) | — | — | — | — | 40 | 50 | 30 | 40 |
| 8. Стральба з дробнакаліберпай вінтоўкі на 25 м (ачкі) | 37 | 43 | 35 | 37 | 37 | 43 | 35 | 37 |
| або на 50 м (ачкі) | 34 | 40 | 34 | 40 | — | — | — | — |
| Стральба з баявога ружжа на 100 м (ачкі) | 70 | 75 | 60 | 65 | — | — | — | — |
| 9. Турысцкі паход з праверкай турысцкіх навыкаў | 1 паход на 25 км або 2 па 15 км | 1 паход на 30 км або 2 па 20 км | 1 паход на 20 км або 2 па 12 км | | 1 паход на 25 км або 2 па 15 км | Тое ж, што і мужчыны | | |
| 10 Спартыўны разрад па любому віду спорту | — | II | — | — | — | II | — | — |

Заўвагі: на залаты значок неабходна выканаць не менш 7 норм на узроўні патрабаванняў, устаноўленых для залатога значка, а 2 нормы на узроўні патрабаванняў, устаноўленых для сярэбранага значка (выключаючы 10-ю норму).

На залаты значок з адзнакай неабходна выканаць усе патрабаванні і нормы на залаты значок і мець адзін першы разрад або два другія разрады.

# ДАЁШ ГПА!

*Сакавік па календару—вясенні месяц. І няхай у нашых краях ён не радуе асаолівым цяплом, але вясна ёсць вясна. З апошніх сіл стараецца зіма яшчэ хоць тыдзень, дзень пагуляць са сваімі марозамі і снегам, але гэта удаецца ёй усё цяжэй.*

*І вось у такую пару выйшлі нашы студэнты на лыжную трасу для здачы норм новага комплексу ГПА. Яркае сонца, транспаранты з прывітаннямі, балельшчыкі і удзельнікі — усё так урачыста і весела, што можна падумаць: мы трапілі на нейкае маладзёжнае свята. Але гэта і ёсць свята —свята сілы, спрыту, маладосці!*

*Нашы студэнты з энтузіязмам прынялі палажэнне аб новым комплексе ГПА. Пачаць здачу норм было даверана старэйшым курсам — III і IV. І хоць старшакурснікі лічацца больш інертнымі, на трасу выйшлі амаль усе. Гэта яшчэ раз гаворыць аб тым, наколькі папулярны гэты комплекс у моладзі.*

*Праўда, падвяло надвор'е. Вясенняе сонца ператварыла снежную трасу ў вясёлыя ручайкі, і рабятам даводзілася літаральна «плыць» на лыжах, але, дзякуючы добрай арганізацыі і старанню саміх студэнтаў, здача прайшла на высокім спартыўным узроўні. Усе студэнты выканалі нормы ГПА па лыжах. Па вясёлых тварах хлопцаў і дзяўчат можна было меркаваць — яны задаволены.*

*Пачатак ёсць. Кліч «Даёш ГПА!», думаецца, будзе падхоплен усімі студэнтамі універсітэта. Кожны павінен быць значкістам ГПА.*

*А. КОЎШАЛЬ,*
*член камітэта камсамола геафака.*

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

**Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19.**

АТ 03137. **Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2 000 экз. Заказ 350.**